СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Камуністычная партыя (бальшэвікоў) Беларусі.

# СТАЛІНЕЦ

ОРГАН ГРЭСКАГА РК КП(б)Б

№ 8 (739) | Субота, 5 лютага | 1944 г.

**Партызаны і партызанкі падрыўнікі! Мініруйце чыгункі і шасэ, не прапускайце да лініі фронта нямецкіх эшалонаў і аўтамашын, абяскроўлівайце ворага, дапамагайце фронту нанесці канчатковы ўдар па нямецка-фашысцкім ордам.**

## Падрыўнікі, памнажайце свае поспехі

Фронт прыблізіўся да граніц нашай області. Па чыгуначных і шасэйных дарогах, якія праходзяць праз нашу област, працiўнік падвозіць да лініі фронта жывую сілу, тэхніку і боепрыпасы.

Але народныя мсціўцы не даюць ворагу спакойна рухацца па нашай зямлі. Бесперапынна ўзлятаюць у паветра нямецкія эшалоны і аўтамашыны. Гэта — вынікі работы партызан - падрыўнікоў.

Падрыўнікі нашага раёна за час сваей дзейнасці ўзарвалі 32 нямецкіх воінскіх эшалоны і звыш 250 аўтамашын ворага. Некаторыя падрыўнікі маюць на сваіх баявых рахунках па некалькі спушчаных пад адкос эшалонаў, дзесяткі ўзарваных аўтамашын і сотні забітых гітлераўцаў.

Цяпер, калі пад ударамі нашых войск немцы адступаюць, калі Чырвоная Армія яшчэ раз падцвердзіла сваю высокую стратэгічнасць, баявую вывучку і манэўранасць ачышчэннем ад ворага вялікіх тэрыторый на поўдзень ад Ленінграда, акружэннем дзесяці нямецкіх дывізій на Украіне, калі немцы, адступаючы, узмацнілі рух па дарогах, — цяпер асаблівай рашучасці і баявой энергіі патрабуецца ад падрыўнікоў.

Партызаны і партызанкі падрыўнікі! Узмацняйце сваю слаўную і бяссмертную барацьбу—пускайце пад адкос варожыя эшалоны, узрывайце аўтамашыны, дапамагайце фронту. Гэтым вы набліжаеце час нашай перамогі над ненавіснымі акупантамі.

## X сесія Вярхоўнага Совета СССР 1-га склікання

Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцей зацвердзілі „Закон аб дзяржаўным бюджэце СССР на 1944 год“.

Па другому пытанню „Аб пераўтварэнні Народнага Камісарыята Абароны і Народнага Камісарыята Замежных Спраў з агульнасаюзных у саюзнарэспубліканскія народныя камісарыяты“ з дакладам на сесіі выступіў, сустрэты бурнай авацыяй, намеснік Старшыні Совета Народных Камісараў СССР таварыш В. М. МОЛАТАЎ.

Пасля абмеркавання гэтага пытання Вярхоўны Совет СССР раздзельным галасаваннем па палатам аднагалосна зацвердзіў „Закон аб стварэнні вайсковых фарміраванняў саюзных рэспублік і пераўтварэнні ў сувязі з гэтым Народнага Камісарыята Абароны з агульнасаюзнага ў саюзнарэспубліканскі народны камісарыят“ і „Закон аб прадстаўленні саюзным рэспублікам поўнамоцтваў у галіне знешніх адносін і аб пераўтварэнні ў сувязі з гэтым Народнага Камісарыята Замежных Спраў з агульнасаюзнага ў саюзна-рэспубліканскі народны камісарыят“.

Пасля прыняцця гэтых законаў з прапановай па 3 пункту парадка дня — „Аб першым намесніку Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР“ выступіў таварыш М. І. КАЛІНІН.

Вярхоўны Совет сумесным галасаваннем абедзвюх палат аднагалосна выбраў першым намеснікам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР таварыша ШВЕРНІКА Н. М.

На гэтым X сесія Вярхоўнага Совета СССР зачынілася.

## З аператыўных зводак Совінформбюро

(З 1-га ПА 5 ЛЮТАГА)

Войскі Ленінградскага фронта занялі г. Кінгісеп і 140 населеных пунктаў.

Захадней Любань, Ноўгарад і Новасакольнікі нашы войскі занялі звыш 60 населёных пунктаў і 5 чыгуначных станцый.

Войскі 2-га Украінскага фронта з раёна паўночней Кіраваграда і войскі 1-га Украінскага фронта з раёна паўдёва-усходней Белая Царкоў прарвалі сільна ўмацаваную абароту немцаў і за 5 дзён баёў прайшлі насустрач друг другу ад 50 да 75 км. і расшырылі прарыў на кожным участку наступлення да 160—175 км. па фронту. Войскі гэтых франтоў злучыліся ў раёне Звенігародка, Шпола і замкнулі кальцо акружэння группіроўкі працiўніка, дзейнічаючай паўночней гэтай лініі, у саставе 9 пяхотных і адной танкавай дывізіі. Нашымі войскамі вызвалена звыш 300 населёных пунктаў, у тым ліку гарады: Смела, Шпола, Звенігародка, Канеў, Багуслаў, райцэнтры Кіеўскай області Ротмістраўка, Лісянка Міронаўка і 13 чыгуначных станцый.

За чатыры дні баёў падбіта і знішчана 310 нямецкіх танкаў і збіта 237 самалётаў працiўніка.

## ПАРТЫЗАН-ПАДРЫЎНІК! КОЛЬКІ ТЫ ЎЗАРВАЎ НЯМЕЦКІХ ЭШАЛОНАЎ І АЎТАМАШЫН?

## Эшалоны пайшлі пад адкос

Студзеньская ноч. З усхода чутна франтавая кананада. Ікожны ўзрыў—запал энергіі, новы выбух жадання біць ворага, дапамагаць наступаючым часцям Чырвонай Арміі. Пры такой абстаноўцы, з такімі пачуццямі мы ішлі выконваць баявую задачу—пускаць пад адкос нямецкі воінскі эшалон.

У кожнага быў баявы дух, смеласць, рашучасць і ўпэўненасць у выкананні атрыманага задання. Падрыўнік Гарбачоў В. і яго напарнікі Туманаў П., Гайдучэнка М., Дудкін І., Секлярэнка М. і я роўнымі крокамі, а затым паўзком прабіраліся да чыгункі. Падрыўнік Гарбачоў В. з Туманавым П. вышлі на чыгуначнае палатно і палажылі пад рэльсу толавы зарад.

Больш 4-х гадзін з нецярпеннем прышлося чакаць эшалона. Толькі а 3-й гадзіне ночы пачулася кулямётнае сакатанне і шыпенне цягніка. Свіст куль усё бліжэй. Узмацняецца шыпенне цягніка. Цягнік падыходзіць да месца, дзе пастаўлена міна. Стукае ад радасці сэрца. Яшчэ хвіліна нямецкі эшалон, ішоўшы да лініі фронта з жывой сілай і ваеннай тэхнікай, паляцеў пад адкос. Больш 70 гітлераўцаў было забіта, мноства тэхнікі, вагоны і паравоз не дайшлі да фронта. Больш 10 гадзін не працавала чыгуначная лінія Пухавічы—Рудзенск.

Мы былі абрадаваны поспехамі і, маючы ў запасе міну, аднадушна рашылі не дапусціць да фронта яшчэ адзін эшалон працiўніка. Адпачыўшы, праз некаторы час, ноччу мы зноў замініравалі чыгунку. На гэты раз наша міна ўла жыла да 150 немцаў, вывела са строю паравоз. Многа гадзін працiўнік падбіраў трупы сваіх салдат і афіцэраў.

М. КАНАЕЎ,
Ком. аддзялення атрада ім. Ч.

## Наш баявы рахунак—чатыры эшалоны

Валодаючы падрыўной справай, я навучыўся на майстэрску біць нямецкіх акупантаў, знішчаць іх ваенную тэхніку, пускаць пад адкос эшалоны працiўніка.

Зараз наша падрыўная група мае на сваім рахунку 4 спушчаныя пад адкос нямецкія воінскія эшалоны, ішоўшыя к лініі фронта. Адзін эшалон працiўніка намі спушчан пад адкос з жывой сілай і ваеннай тэхнікай. У выніку крушэння эшалона было знішчана 6 вагонаў з жывой сілай і 2 платформы з зянітнымі пушкамі. Пры крушэнні другога эшалона, спушчанага пад адкос, разбіта 2 платформы і 4 вагоны з харчаваннем. Крушэннем трэцяга і чацвертага эшалонаў было знішчана 3 паравозы і 12 вагонаў з боепрыпасамі, забіта звыш 120 гітлераўцаў.

І. САВЕНОК,
атрад імя К.

## Узарваў дзевяць аўтамашын

У атрадзе імя Б. добра ведаюць партызана Івана М., які, авалодаўшы падрыўной справай, усю сваю энергію аддае барацьбе супроць подлых захопнікаў. 9 узарваных нямецкіх аўтамашын, якія знішчаны ў выніку мініравання шасэ комсамольцам - падрыўнікам Іванам М., мае ён на сваім баявым рахунку. Разам з машынамі забіта 76 нямецкіх салдат і афіцэраў, многа паранена.

За адданасць і рашучасць, за ўмелае выкананне заданняў Іван М. назначан камандзірам аддзялення.

ВЛАДЗІМІР Б.

## Наша дапамога

Сяляне нашай вёскі ўжо другі год не выконваюць нямецкіх распараджэнняў. Мы не хочам, каб наш хлеб, вырашчаны на зямлі, апрацаванай намі, пайшоў у горла ненавісных чужынцаў. Мы ўсе ўпэўнены і добра ведаем, што Чырвоная Армія гоніць немцаў з нашай зямлі і хутка прыдзе да нас. З свайго боку, мы дапамагаем партызанам у іх барацьбе супроць акупантаў. Уся моладзь нашай вёскі знаходзіцца ў партызанскіх атрадах.

Мы здалі энскаму партызанскаму атраду 41 цэнтнер зярна, 204 цэнтнеры бульбы, 173 цэнтнеры сена, 5 цэнтнераў крупы і 8 цэнтнераў гародніны.

Усё насельніцтва вёскі разам з партызанамі прымала ўдзел у разрушэнні магістралі ворага.

Нашы дзяўчаты зрабілі для партызан некалькі дзесяткаў пар цёплых наскоў і рукавіц. Зараз яны рыхтуюць падарункі байцам Чырвонай Арміі.

Усе сяляне нашай вёскі абавязаліся яшчэ больш актыўна дапамагаць фронту і партызанам, каб прыблізіць час свайго вызвалення.

ПАВЕЛ П.,
селянін энскай вёскі.

## У вызваленым Гомелі

У горадзе ўжо працуе млын, які меле 30 тон збожжа ў суткі, працуе 6 хлебапякарняў. У поўным разгары работы па аднаўленню вадаправода, гарадской лазні. Горад хутка атрымае электрычнае асвятленне. У горадзе працуе 4 цырульні.

Шмат увагі ўдзяляюць гарадскія арганізацыі кватэрнаму пытанню. Для рамонта дамоў арганізавана кантора жыллёвага ўпраўлення.

Вядуцца работы па арганізацыі майстэрняў, на заводзе імя Кірава абсталёўваецца жалезнаскабяная майстэрня, а на лыжкавай фабрыцы—майстэрня па рамонту лыжкаў.

РЭДКАЛЕГІЯ.

Выданне Грэскага РК КП(б)Б Друкарня газеты „Сталінец".

Нацыянальная бібліятэка Беларусі